УДК 882.6

**С.І. ДАНІЛЕНКА**

# МІФАЛАГІЗАЦЫЯ ЗМАГАННЯ З ВОРАГАМІ НОВАГА ЖЫЦЦЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ 30 – 50-х гг. ХХ ст.

З першых дзён маладая савецкая дзяржава была вымушана весці зацятую барацьбу за сваё існаванне. І ў гэтых варунках эсхаталагізм, прыналежны камунізму, які абвясціў вайну "старому" свету прыгнёту і эксплуатацыі, дзеля пабудовы "новага" Царства Справядлівасці на зямлі, не мог не адлюстравацца ў шэрагу ўражлівых метафар, якія ляглі ў падмурак ідэалогіі краіны перамогшага пралетарыяту. Эсхаталагічная барацьба – гэта перш за ўсё апошняе змаганне сіл дабра і зла. Таму натуральна, што "знешняе аблічча" гэтага зла, вельмі часта запазычвалася прапагандыстамі новага жыцця са старой культурнай традыцыі, як фальклорнай, так і кніжнай, перш за ўсё з той мэтай, каб яны былі блізкімі і зразумелымі насельніцтву малапісьменнай сялянскай краіны. Таму адным з краевугольных камянёў савецкай сацыяльнай міфатворчасці з'яўлялася дэманізацыя ворагаў пралетарскай дзяржавы, што не магло не знайсці свайго адлюстравання ў беларускай савецкай паэзіі тых часоў.

Перамозе пралетарыяту і паўстанню "*скалы*" савецкай дзяржаўнасці папярэднічала зацятае змаганне з "чорнымі" сіламі старога свету, і "*абставіны, што склаліся, настойліва патрабавалі ўражлівых вобразаў і сімвалаў <...> Прапаганда першых год рэвалюцыі дала штуршок развіццю савецкай агіяграфіі і савецкай дэманалогіі*" [6, с. 66]. Таму часам гэтае змаганне малюецца беларускімі савецкімі паэтамі як магічнае супрацьстаянне сіл святла супраць дэманічных сіл цемры і зла, супраць "*закляцця вякоў*", "*цемры папоўскай імглы*", супраць "*тхлані і наслання ліхіх ведзьмакоў*" (Якуб Колас "Нашы дні" (1933)) [3, с. 69], якія "*на шурпатай кары*" "*клалі знак*" "*на людскую нядолю і гора*" (Якуб Колас "Да тыдня беларускай культуры" (1931)) [3, с. 54]. У сваю чаргу Янка Журба тлумачыць паўстанне "*камуны сусветнай*", дзе "*быццам сонца, заззяе жыццё*" [1, с. 27] у вершы "Ясны шлях" тым, што бальшавікі "*спалілі заломы*", "*ускаласілі загоны*" "*на прасторах цалінных палёў*" [1, с. 26], "*хоць варожы табун адзічэлы*" "*ёй імшу пахавальную крумкаў*" (Янка Купала "Песня будаўніцтву" (1931)) [5, с. 13]. Паводле традыцыйных уяўленняў чалавека архаічнай свядомасці залом – гэта "*зламаны ці зблытаны чараўніком (ведзьмаром) пук жытніх сцяблоў, які, <...> мог наклікаць бяду на гаспадарскую ніву, прывесці да хваробы ці нават да смерці саміх гаспадароў <...> Вырваць залом, "адрабіць" яго запрашалі знахара ці ведзьмара. Залом вырывалі асінавымі трэскамі ці палкамі, спальвалі яго, кінуўшы на залом пук саломы ці асінавыя трэскі*" [2, с. 65-66]. І беларускія савецкія паэты прыклалі ўсе намаганні, каб стварыць уражлівыя апакаліптычныя малюнкі дэманічнай "порчы", насланай "*заломамі*", і яе наступстваў, ад якіх пакутваў працоўны чалавек да перамогі пралетарскай рэвалюцыі. Так, Якуб Колас у вершы "Савецкай Беларусі" (Да дваццацігоддзя) (1938) вызначае, што "*зямелька*" была "*багата*" "*кроўю паліта*" [4, с. 57], "*абалівалася крывёй поле роднае*", "*вецер заводзіў малітву жалобную*", "*чорны груган збіраў белыя косці*" (Янка Купала "Беларусі ардэнаноснай" (1935)) [5, с. 60]. І на гэтай "праклятай" сіламі зла зямлі беларускі

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

народ, якога "*губіў пан-кат*", "*сотні год*" "*ліў кроў і пот*" і "*скарынцы хлеба* <...> *быў рад*" (Янка Купала "Настаў чарод..." (1939)) [5, с. 159]. У згаданых вершах "сілы цемры", што заламалі "*залом*", "*чужацкія госці*", што "*балявалі*" на сваім чартоўскім ігрышчы (Янка Купала "Беларусі ардэнаноснай" (1935)) [5, с. 60], досыць акрэслена персаніфікуюцца: "*варшаўскі зброд*", "*пан-кат*" (Янка Купала "Настаў чарод..." (1939)) [5, с. 159], "*пан*", "*кайзер пракляты*", "*генералы*", "*атаманы*", што "*на вольныя гоні кавалі кайданы*" (Якуб Колас "Совецкай Беларусі" (Да дваццацігоддзя) (1938)) [4, с. 57]. Гэта прадстаўнікі старых сацыяльных вярхоў, што "эксплуатавалі" працоўнага чалавека, прадстаўнікі старой вайсковай эліты, што абаранялі іх інтарэсы, і іншаземцы-заваёўнікі. Аднак для іх усіх агулам вызначаецца сувязь з "нячыстай" сілай, бо "*розная нечысць брыла ўслед за імі*" (Якуб Колас "Совецкай Беларусі" (Да дваццацігоддзя) (1938)) [4, с. 57]. Больш за тое, яны самі – "нячыстая сіла", падобная да пана-"*упыра*" з верша Янкі Купалы "Калгасу "Чырвоны баец" (1934): "*Жыў сабе упырам, // Седзячы ў палацы, // Пух сабе ад жыру // З батрацкае працы*" [5, с. 38].

Аднак панаванне "*нечысці*" не будзе вечным, не "*будзе здзек*" працоўнаму чалавеку "*ўвесь век*" "*крывавых слёз тачыць з павек*" (Янка Купала "Настаў чарод..." (1939)) [5, с. 160], бо ўрэшце дачакаўся ён, каб "*у царскае горла урэзацца*", "*кроў з панскіх выпусціць жылаў*" (Янка Купала "Беларусі ардэнаноснай" (1935)) [5, с. 60]. Таму панаванне старога света "*упыроў*" развейваецца пад ударамі раскаванага пралетарыята, пакінуўшы пасля сябе струхлелыя парэшткі (Янка Купала "Верасень месяц..." (1939)): "*Як днём начніцы, разбегліся госці, // Што з беларуса смакталі кроў ласа. // Чорны груган клюе панскія косці, // З трупаў гербоўных складае запасы*" [5, с. 148].

Пераможаная цемра параўноўваецца паэтам з найбольш каларытнымі персанажамі народнай дэманалогіі: упырамі, што "*смакталі кроў*" беларуса, непахаванымі належным чынам заложнымі нябожчыкамі, чые косці "*груган клюе*", начніцамі – "*начнымі жанчынападобнымі дэманічнымі істотамі, якія па начах непакояць дзяцей, насылаючы на іх плач, крыкі (крыксы), адганяюць сон*", якіх "*уяўлялі ў выглядзе птушак, кажаноў, зданяў, радзей – у выглядзе старых жанчын з доўгімі валасамі ў чорнай вопратцы. Лічылі, што Начніцамі станавіліся пасля смерці ведзьмы ці злыя чараўніцы, якіх праклялі людзі*" [2, с. 107]. Гэты вобразны шэраг павінен быў выклікаць у свядомасці малапісьменнага і ўсё яшчэ прымхлівага чытача-селяніна выхаваную шматвекавой традыцыяй народнай культуры агіду і нянавісць да колішніх "гаспадароў" старога свету, прадэманстраваўшы іх "сапраўдную" ўнутраную чалавеканенавісніцкую сутнасць, варожую самому жыццю.

Таму і справа змагання з "нечысцю" і ліхімі "*ведзьмакамі*" па сілах толькі "сапраўдным чарадзеям", але чарадзеям светлым, "чарадзеям", якія стаяць на абароне працоўнага чалавека, несучы яму "чароўнае" шчасце, што найбольш яскрава ўвасобілася ў вершах Якуба Коласа: "*большэвіку-чарадзею*" ("Нашы дні" (1933)) [3, с. 69], "*юнасці-чарадзеям*" ("Камсамольцам" (1935)) [3, с. 81], "*Леніну-прароку*" ("У зале Крэмлёўскага палаца" (1946)) [3, с. 365], Сталіну – "*прароку-чарадзею*", каго "*славяць сягоння народы*" ("Выглядаеш ты яснай вясной..." (1946)) [3, с. 367], "*генію-прароку*" ("Першы дэпутат" (1947)) [3, с. 369], "*трыбуну-прароку*", які "*даль вякоў раскрыў шырока*" з "*яе прывабнай глыбінёй*" ("Ленінскім шляхам" (1952)) [3, с. 395].

Таму не выклікае ніякага здзіўлення, што змаганне "*большэвікоў-чарадзеяў*" са злавеснай "нечысцю" ўвасаблялася ў беларускай савецкай паэзіі ва ўражлівых малюнках, што сілкаваліся вобразнасцю адвечнага нябёснага змагання светлага бога-грымотніка з пачварнымі дэманамі начнога змроку, калі сілы святла

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

паўставалі ў абліччы "*жалезных кагорт*" (Якуб Колас "Гераічнай Іспаніі" (1936)) [3, с. 113], "*сталёвых калон*" з "*гартам бальшэвіка*". Іх "*паход*" – "*гоман буры*", іх "*удары*" – "*пярун*", што абараняе "*славу дыктатуры*", "*советаў і комун*" (Якуб Колас "Да 15-й гадавіны Кастрычніка" (1932)) [3, с. 61-62]. І на чале гэтых "*калон*" стаіць Сталін – сам бог-грымотнік, мудрэйшы і "мацнейшы" "*чарадзей*" з "*нядрэмным орлім вокам*", для якога не існуе варожых таямніц (Якуб Колас "Правадыру і настаўніку" (1939)): "*<...> Глашатаяў здзеку, гнёту і мроку, // Разгадваеш проста, мудра, глыбока // Зладзейскія сцежкі, сляды. // Магутнай рукою, смела, імкліва // Ты крышыш былога ланцуг*" [3, с. 236].

Вызваленне Беларусі ад "дэманаў" мінуўшчыны – гэта вызваленне яе ад самой смерці, якую "*ўрачыста*" вартуе "*варта*" з кулямётам, што "*прыцэл свой знае*" (Янка Купала "З Першым маем" (1941)): "*Пад расстрэлам стаяць больш не будзеш нідзе, // Больш тыран ланцуга на цябе не ўскладзе, // Бомбы больш не спадуць з самалетаў, // Кветкі сыпацца будуць з высотаў*" [5, с. 171].

Такім чынам, змаганне з ворагамі пралетарыяту за новае шчаслівае жыццё для працоўнага чалавека асэнсоўвалася беларускімі савецкімі паэтамі 30 – 50-х гг. XX ст. як адвечнае супрацьстаянне сіл святла і дабра з аднаго боку і сіл цемры і зла з іншага. Гэта дазваляла лакальныя палітычныя канфлікты канкрэтнай эпохі ўвесці ў кантэкст сусветнай гісторыі, а таксама ўвасобіць іх драматызм у найбольш аўтарытэтных для чалавека архаічнай свядомасці вобразах і метафарах.

### *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Журба Я.*** Светлыя дні. – Мінск: Дзяржаўнае вучэбна-педагагічнае выдавецтва Міністэрства асветы БССР, 1959. – 144 с.
2. ***Коваль У.І.*** Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы: Даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі. – Гомель: Беларускае Агенцтва навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 1995. – 180 с.
3. ***Колас Якуб.*** Збор твораў у 7 т. Т. 2. Вершы. Апавяданні вершам (1917 – 1952). – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1952. – 459 с.
4. ***Колас Я.*** Пад сталінскім сонцам. Вершы 1937 – 1939 гг. – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва пры СНК БССР. Рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1940. – 172 с.
5. ***Купала Я.*** Поўны збор твораў. У 9 т. Т. 5. Вершы, пераклады 1930 – 1942. – Мінск: Маст. літ., 1998. – 278 с.
6. ***Тумаркин Н.*** Ленин жив! Культ Ленина в Советской России / Пер. с англ. – СПб., Гуманитарное агенство "Академический проект", 1997. – 285 с. Серия "Современная западная русистика".



### SUMMARY

*The article analyses the impact of mithological tradition on the imagery of the Belarusian patriotic poetry of the 30 – 50 s (the XX*[th] *century).*


Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова